Трамбіцкі У.У.,
ст.выкладчык

## ТРАДЫЦЫЙНЫЯ І АВАНГАРДНЫЯ МЕТАДЫ Ў ВУЧЭБНЫМ І ВЫХАВАЎЧЫМ ПРАЦЭСАХ

Узаемасувязь традыцыйнага і авангарднага ў культуры вельмі складаная. Ёсць сэнс спыніцца на ўзаемасувязі традыцыйных і авангардных метадаў. У якасці традыцыйных метадаў у выхаваўчым працэсе могуць выступаць:

1) кантроль і самакантроль,
2) спалучэнне ў выхаванні асабістых і грамадскіх інтарэсаў.

З найбольш вядомых метадаў у вучэбным працэсе можна вылучыць:

1) лекцыі,
2) практычныя заняткі,
3) напісанне кантрольных работ і рэфератаў.

Да авангардных метадаў у вучэбным працэсе можна аднесці:

1) лекцыі-дыялогі,
2) дзелавыя гульні,
3) аўтарскія спецкурсы,
4) складанне праграм з улікам здольнасцей студэнтаў.

Пералічаныя метады самі па сабе, без асабістых інтарэсаў і намаганняў студэнтаў не могуць быць эфектыўнымі. Для тых, хто мае цікавасць да вучобы, выкарыстанне як традыцыйных, так і авангардных метадаў садзейнічае развіццю інтэлектуальных і творчых здольнасцей.

Далёка не заўсёды новае, прагрэсіўнае без супярэчнасцей знаходзіць сабе месца ў культуры. Традыцыйнае, як правіла, аказвае супраціўленне. Але і авангарднае, новае не заўсёды з'яўляецца лепшым, больш прагрэсіўным, чым традыцыйнае. Такая ўзаемасувязь традыцыйнага і новага мае месца ў многіх відах чалавечай дзейнасці і формах культуры. Складаную ўзаемасувязь традыцыйнага і новага можна паказаць і на прыкладах бібліятэчнай, музычнай, палітычнай, прававой і маральнай культур.

Студэнт жа можа выступаць у якасці суб'екта і аб'екта розных формаў культуры.

Не трэба забываць, што сам вучэбны працэс здольны выконваць выхаваўчыя функцыі. У вучэбным працэсе малады чалавек можа атрымаць такія якасці, якія яму будуць патрэбны ў сямейнай, працоўнай і іншых сферах жыцця.

У сучасных умовах, калі ў нашым грамадстве на змену адным каштоўнасцям прыходзяць другія, можна некаторыя падыходы запазычыць з іншых краін. Напрыклад, у ЗША ў 60-я гады нашага стагоддзя ажыццяўлялася праграма «Мерыт». Кожны год адбіралі 600 тысяч лепшых вучняў. Потым з іх адбіралі каля 35 тысяч з найлепшымі паказчыкамі. Гэты вопыт праводзіўся на працягу 15 гадоў. На аснове яго ўзніклі праграмы ранняга навучання.

Можа ёсць сэнс выкарыстаць падобны метад? Выкладанне для «нармальных» з'яўляецца прычынай «пагібелі» вельмі здольных.

Сабаленка Э.Р.,
дацэнт

## ЭСТЭТЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ЭСТЭТЫКІ

1. Гуманітарная падрыхтоўка студэнтаў нашага універсітэта ў сучасных умовах патрабуе грунтоўных ведаў нацыянальнай культуры ад яе зараджэння і па сённяшні дзень. Вельмі важнае месца ў сістэме гэтых ведаў займае эстэтычная думка Беларусі. Таму правамерна ў досыць невялікім курсе эстэтыкі (50-72 гадзіны) асобна вылучыць тэму «Зараджэнне і развіццё эстэтычнай думкі на Беларусі», на якую адвесці не менш 6 гадзін.

2. У структуры лекцыйнага курса гэту тэму найбольш лагічна чытаць пасля азнаямлення студэнтаў з гісторыяй развіцця еўрапейскай эстэтыкі. Гэта дасць магчымасць разглядаць беларускую эстэтычную думку ў кантэксце еўрапейскай. Па-першае, паралелі з еўрапейскай эстэтыкай дазваляюць пераадолець некаторы скептыцызм студэнтаў у адносінах да гэтай тэмы, таму што паралелі пераканаўча сведчаць, што не толькі Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францішак Скарына і інш. не былі чыстымі эстэтыкамі, але такімі не былі і ўсе еўрапейскія мысліцелі, якія даўно па праву занялі свае месцы ў гісторыі сусветнай эстэтыкі. Па-другое, параўнанне з еўрапейскай эстэтыкай пераконвае, што беларуская эстэтыка на працягу стагоддзяў развівалася на еўрапейскім узроўні.

3. Зараджэнне навуковай эстэтычнай думкі на Беларусі пачынаецца з дзейнасці Еўфрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага, якія ў рамках хрысціянскай тэалогіі разглядаюць праблемы прыгажосці і мастацтва. У іх выказваннях аб іерархіі формаў красы знаходзім многа сугучнага тэарэтычным палажэнням Аўгусціна, а затым Тамаша Аквінскага.

4. На еўрапейскім узроўні развіваецца эстэтычная думка Беларусі ў эпоху Адраджэння. Рэнесансны культ прыгажосці ў творах Ф.Скарыны, М.Гусоўскага, гуманістычнае ўзвелічэнне чалавечага розуму ў С.Буднага, нацыянальна-патрыятычныя ідэі В.Цяпінскага маюць выразныя паралелі ў заходнееўрапейскай культуры.

5. Як важная неад'емная частка еўрапейскай культуры развіваюцца на Беларусі тэорыя і практыка барока. Безумоўна, фігурамі еўрапейскага маштабу былі К.Сарбеўскі, Ж.Лаукмін, С.Полацкі. Іх тэорыі прыгажосці, мастацтва ўзбагачаюць сусветную эстэтыку і павінны па праву заняць у ёй належнае месца.

6. Асаблівую цікавасць у кантэксце еўрапейскай эстэтыкі пачатку XX ст. мае мастацкая і навуковая творчасць Максіма Багдановіча. У літаратурна-крытычных артыкулах, апавяданнях, эцюдах, вершах ён звяртаецца да надзвычай складаных эстэтычных праблем і вырашае іх глыбока і арыгінальна. Прыярытэт агульначалавечых эстэтычных каштоўнасцей, пераадоленне вузкакласавай абмежаванасці даюць магчымасць разглядаць эстэтычную праграму Максіма Багдановіча ў межах па меншай меры агульнаеўрапейскай эстэтыкі. Наогул пульс эстэтычнай думкі на Беларусі ў пачатку XX ст. сведчыў, што на хвалі нацыянальнага адраджэння яна ўздымалася на новы, больш высокі ўзровень.

Марозаў В.В.,
дацэнт

## МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ ФІЛАСОФІІ СТАРАЖЫТНАГА ЎСХОДУ

1. Зразумець асаблівасці любой філасофіі можна толькі ў кантэксце таго або іншага тыпу культуры. Філасофія з'яўляецца жывой душой культуры і, зразумела, што асаблівасці культуры адлюстроўваюцца ў філасофскіх канцэпцыях. Таму, калі пачынаецца вывучэнне пэўнага гістарычнага тыпу філасофіі, прапануем пачынаць з разгляду асаблівасцей культуры і філасофіі (напрыклад, старажытнага Кітая або старажытнай Індыі).

Гэта абумоўлена яшчэ і тым, што існуе пераемнасць паміж культурамі, якая таксама павінна абгрунтоўвацца і адлюстроўвацца ў пераемнасці паміж рознымі філасофскімі напрамкамі.

2. На занятках па філасофіі старажытнага Ўсходу можна абмежавацца разглядам філасофскіх сістэм Кітая і Індыі, таму што ў іншых рэгіёнах, напрыклад у Егіпце, Вавілоніі, светаўспрыманне засталося ў асноўным на міфалагічным узроўні. Прапануецца таксама разглядаць іх асобна, а не разам, як гэта зроблена ў падручніку «Введение в философию» (М.,1989,ч.1, пад рэд. І.Ц.Фралова). У гэтым падручніку параўнанне кітайскай і індыйскай філасофіі вельмі няўдалае: яно не дае дастатковых ведаў у галіне асаблівасцей і непаўторнасці кітайскай і індыйскай культур.

3. Пры разглядзе філасофіі старажытнага Кітая прапануецца пачынаць з асноўных супярэчнасцей кітайскага грамадства паміж царом (вана) і сялянскай абшчынай. На наш погляд, гэта трэба зрабіць у пачатку лекцыі, таму што выкладзены матэрыял аказвае ўплыў на разуменне і ўспрыманне ўсіх астатніх асаблівасцей як кітайскай культуры (роля традыцыі, рытуалу, культу продкаў, адсутнасць інстытута жрацоў, бесперапынная пераемнасць кітайскай культуры), так і кітайскай філасофіі (галоўная роля маральнай тэматыкі, палітычныя пытанні, праблема дабра і зла, маральнае аблічча цара і інш.).

4. Мяркуецца, што іншыя пытанні датычацца разгляду асноўных філасофскіх школ старажытнага Кітая. Прапануем абмежавацца чатырма з іх: канфуцыянствам, маізмам, даасізмам, легізмам. Пры гэтым мяркуецца параўнанне гэтых школ, тлумачэнне пераемнасці ў поглядах іх прадстаўнікоў, узаемаўплыў розных школ. Пры вывучэнні першых трох, на наш погляд, трэба выкласці наступныя пытанні: асноўныя прынцыпы маралі і дыскусіі па іх зместу, размежаванне поглядаў на «высакароднага мужа» і «нізкіх людзей», адносіны да традыцый, погляды на ўладу і маральнае аблічча цара, яго паводзіны.

5. Пры разглядзе пытання аб асаблівасцях культуры і філасофіі старажытнай Індыі неабходна ўлічваць, па-першае, варнавы строй індыйскага грамадства як аснову рэгулявання адносін паміж кастамі; па-другое, галоўную ідэю сансары і шляхоў дасягнення мокшы шляхам аскетызму, уяўленні аб брахмане (атмане), дхарме і карме. Трэба паказаць уплыў ведычных тэкстаў, асабліва упанішад, на развіццё філасофскай думкі Індыі, а таксама ролю брахманізму.

6. Далей прапануецца перайсці да абмяркавання асноўных філасофскіх сістэм. Да іх можна прылічыць джайнізм, будызм, чарвака-лакаята, а таксама шэсць даршан.

Языковіч В.Р.,
дацэнт

## РЭЛІГІЯЗНАЎЧЫЯ КУРСЫ Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ КУЛЬТУРЫ

Вядома, што рэлігія з'яўляецца адным з найбольш моцных і ўплывовых бакоў культуры, важным і цікавым праяўленнем чалавечага духу. Таму сур'ёзнае вывучэнне рэлігіязнаўчай праблематыкі павінна стаць прыярытэтным накірункам падрыхтоўкі спецыялістаў культуры. Работнікі сферы культуры, безумоўна, павінны ўяўляць асаблівасці рэлігіі як з'явы культуры і формы духоўнага жыцця чалавека, ведаць логіку яе гістарычнага развіцця, валодаць асновамі параўнальнага рэлігіязнаўства,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ